Следует отметить, что до сих пор свою нацистскую риторику антисемиты в публичных выступлениях прикрывали идеологической борьбой с сионизмом. Словом «сионист» они, во избежание обвинений в нацистской риторике, заменяли слово «еврей». К примеру, во время судебного процесса, который в Москве авторы антисемитских книг В.Бегун (минчанин), Е.Евсеев и А.Романенко проиграли в октябре 1987 г. газете «Советская культура», было оглашено экспертное заключение Института США и Канады Академии наук СССР, где указывалось, что в семи случаях в текстах В.Бегуна прямо цитируется «Майн кампф» А.Гитлера с заменой слова «еврейский» на слово «сионистский». Видимо, не рассчитывая на успех версии о «сионистско-масонском» заговоре, В.Чертович и В.Акулов извлекли на свет провонявший нафталином древний миф о порочности и расистской сущности иудаизма, об иудаизме как аморальной и извращенной религии: по их мнению, иудаизм, являясь «кодексом поведения еврея в мире, переходит в план практического действия», ибо «теряет свое религиозное содержание, становится фактом идеологии и политики».

Увы, и это мы уже проходили. Покойный В.Бегун еще тридцать лет назад писал: «иудаизм является философско-мировоззренческой основой современного сионизма» («Сионизм и иудаизм», 1972), «синагога в современной обстановке является потенциальной базой подрывной деятельности» («Ползучая контрреволюция», 1974), а еврейская культура является культурой «клерикальной» («Вторжение без оружия», 1977). Доктор философских наук В.Акулов должен был бы во всем этом разбираться. Благодаря В.Бегуну, получившему в свое время прозвище «жидоеда», Беларусь стала одним из центров антисемитской пропаганды в СССР. Его лавры явно не дают покоя новоявленным теоретикам антииудаизма.

Но о иудаизме ли в действительности ведут речь В.Чертович и В.Акулов? В вышеназванной статье они в качестве причины, «вызвавшей столь бурную реакцию служителей Белорусского Экзархата», называют издание книги «Приговор убивающим Россию». Заглянем и мы в эту книгу. Ее автором назван бывший министр по делам печати России, ныне объявленный в розыск за разжигание национальной розни, Борис Миронов. На самом же деле это сборник материалов, представляющих гремучую смесь антиглобализма, антиамериканизма, антисемитизма, антисионизма и неосталинизма. Еврейские организации эту книгу никак не комментировали, ибо в ней вновь муссировались те же самые антисемитские тексты и карикатуры, которые постоянно перекочевывают из одной книги этого издательства в другую и уже довольно-таки приелись. А главное то, что карикатур на В.Путина там едва ли не больше, чем на евреев. И мы решили: с этой книжкой пусть власти разбираются сами.

Что касается евреев, то никакой критикой иудаизма там и не пахнет. Вновь цитируются «Протоколы сионских мудрецов» (с.21

(Заканчэнне на стар. 8–9.)

Лиха беда начало

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 7.)

— 22, 42, 217, 218) и приводится «реферат по материалам книги О.А.Платонова «Загадки сионских протоколов» (с.131—135). Публикуются антисемитские карикатуры (с.107, 444), в том числе 35-летней давности (с.215), а из современных — можно узнать, например, что именно сионисты поддерживают пламя войны в Чечне (с.356). Убийство царской семьи вновь называется «ритуальным» (с.253), а в стихах некоего иеромонаха Романа самым «горшим» злом в мире называется ситуация, «когда Россией правит жид» (с.126). Украина, оказывается, принесена в жертву Сиону (с.98—100), а иудаизм и сионизм вновь становятся синонимами нацизма (с.131).

В книге возникают отрывки из таких современных исторических фальшивок, как «Завещание Сталина» и некое выступление Л.Троцкого (ссылок на источники, естественно, нет). Сталину приписываются слова, что вся его жизнь — «непрекращаемая борьба с сионизмом, цель которого — установление нового мирового порядка при господстве еврейской буржуазии» (с.332), а Троцкому — слова о евреях, которые «восхитительно умеют ненавидеть все русское» и «с наслаждением уничтожают русскую интеллигенцию» (с.350).

Если уж зашла речь о книге «Приговор убивающим Россию», нельзя обойти и открытое письмо группы белорусских общественных деятелей городским властям Минска в защиту ЗАО «Христианская инициатива» и магазина «Православная книга», опубликованное в том же номере (и на той же странице) газеты «Русский вестник», что и статья В.Чертовича и В.Акулова. Авторы письма убеждены, что действия Белорусского Экзархата по отношению к ЗАО продиктованы давлением тех кругов, которые когда-то организовали «кампанию дезинформации, клеветы и доносов» против этого ЗАО из-за выпуска книги «Война по законам подлости», но «тогда свое подлое дело в суде проиграли». Ну что ж, как говорят в таких случаях, на воре шапка горит. Судились тогда с издателями этой «энциклопедии антисемитизма» еврейские организации (их было несколько), возбудившие дело о защите чести и достоинства, но судьи признали книгу «научным изданием», встав на сторону антисемитов и навеки опозорив белорусский суд в глазах мировой общественности.

Ну что ж, во всем этом деле нам видятся два очень важных аспекта. Первый: 15-летняя борьба с теми, кто открыто пропагандирует антисемитизм в белорусских СМИ, привела к тому, что сегодня ни одна газета в Беларуси уже не позволит себе напечатать одиозные антисемитские бредни, и их авторам приходится посылать свои «творения» в Москву, где это еще возможно. И второе: если есть люди, которые считают, что евреи могут командовать руководством Белорусского Экзархата, значит сильно евреев уважают, ибо у нас в стране больше всего признают и уважают силу. Вот только что же это за люди?

В том, что письмо подписали парламентарий С.Костян и художник М.Савицкий, нет ничего удивительного: их давно все знают как безнадежно больных ксенофобией. Обидно за прекрасного актера В.Гостюхина, подверженного этой же болезни. А вот от того, что письмо подписали 12 лидеров Белорусских союзов офицеров, моряков, ветеранов КГБ и ВОВ — люди с высшими воинскими званиями, становится очень тревожно, потому что мы все понимаем, какие структуры за ними стоят.

Что же, на наш взгляд, является ведущим в поведении В.Чертовича и иже с ним? Их откровенное неуважение к закону и к человеческой личности.

Мы уже однажды комментировали мнение В.Чертовича о «господах», которые желают, «чтобы в Беларуси были уравнены все конфессии» (см. «За свабоднае веравызнанне», 2005, №10). Задумывался ли сам В.Чертович, что, задавая в одной из своих статей вопрос: «Не слишком ли многого, однако, хотят эти господа?», он грубо нарушает ст.16 Конституции Республики Беларусь о равенстве религий и вероисповеданий перед законом? Что касается уважения к человеку, то тут В.Чертович призывает «различать здоровый национализм и патологический шовинизм». Себя он, видимо, относит к «здоровым националистам», но при этом почему-то литературу, культивирующую идеи взаимодействия и сближения народов в сочетании с бережным отношением к национальным культурам и традициям, называет «босяцко-космополитической» и забывает при этом, что пропаганда антисемитизма, которой он обесчестил свое имя, и есть «патологический шовинизм».

Последний из приведенных нами тезисов В.Чертович изложил в очередной статье в газете «Русский вестник» (2006, №16), в которой он мучительно пытается оправдаться перед православным миром за те прегрешения, в которых его обвинили иерархи Минской епархии. Вот что пишет этот, представляющий себя читателю глубоко верующим, человек о равенстве людей перед Богом: «До каких пор мы, обрезая и извращая слова апостола Павла, будем культивировать среди верующих ту нелепость, что для христианства нет «ни эллина, ни иудея»?»

Ну что ж, если В.Чертович считает, что эту цитату из Послания апостола Павла галатам постоянно «обрезают», приведем ее полностью: «Нет уже Иудея, ни язычника; нет раба, ни свободного; нет мужеского пола, ни женского; ибо все вы одно во Христе Иисусе» (Гал., 3, 28), что означает: все люди равны. И равны не в христианстве, а перед Богом (естественно, и перед сыном Его также), потому мы все дети Его, а дети для отца все одинаковы — независимо от цвета кожи, языка, традиций и избранных ими верований. И совершенно прав был один из авторов «Книжного обозрения» (П.Карп, 1989, №15), когда написал, что «крещение Руси означало разрыв с узкоплеменным сознанием и переход к космополитическому, для которого «несть ни эллина, ни иудея»... Христианское сознание стало мостом если не к всеобщей, то к общеевропейской культуре, по которому русский народ прошел до высочайших ее вершин». И вот находится в XXI веке некий В.Чертович, убеждающий нас совершить откат в сознании на два тысячелетия назад и считать христиан «равнее» представителей других религий! Не это ли убеждение в исключительности «своей» веры привело в истории к миллионам человеческих жертв?!

«Роман» Союза белорусских еврейских объединений и общин с ЗАО «Православная инициатива» начался в конце 1999 г., когда на прилавках появился сборник антисемитских статей «Война по законам подлости». На 470 страницах этой книги оказались собраны самые одиозные творения, имеющие хождение в среде российских шовинистов: полный текст «Протоколов сионских мудрецов», «Катехизис еврея в СССР», еще целый ряд статей, названия которых говорят сами за себя — «О том, как иудеи отравляют нашу Русь православную», «Слишком много евреев», «Евреи снова в русском Кремле» и т.д. Есть среди статей и посвященная ревизии Холокоста: «Миф о 6.000.000 — самый крупный политический шантаж XX века!!!»

Кроме гражданского, тогда были сделаны попытки возбудить уголовное дело о разжигании национальной вражды, но прокуратура, в компетенцию которой входит возбуждение такого дела, упорно отказывалась это делать. Сначала старший прокурор общего надзора С.Д.Новиков передал заявление лидеров Союза в суд для приобщения к материалам гражданского иска (приобщено оно, кстати, так и не было), а на повторное заявление начальник отдела Республиканской прокуратуры Г.А.Шостак ответил, что «вынесено постановление об отказе в возбуждении уголовного дела в связи с отсутствием в действиях составителей книги признаков состава преступления, предусмотренного ст.71 УК Республики Беларусь (нарушение национального и расового равноправия, а также равноправия граждан в зависимости от их отношения к религии)». То есть, республиканская прокуратура поддержала антисемитов.

Это был первый, но совсем не последний случай, когда еврейская общественность вступала в борьбу с издателями антисемитской литературы из «Православной инициативы». Но прокуратура стойко стояла на страже безопасности носителей нацистских идей, хотя их к этому времени успевали обличить даже те, от кого поддержки трудно было ждать, например, писатель Вадим Кожинов, который отметил, что большинство материалов книги основано на невежестве

или неправде. Но все было напрасно. Как написал в одном из писем прокурор С.Новиков, «позиция Республиканской прокуратуры по этому вопросу доводилась до сведения заинтересованных лиц и организаций неоднократно и каких-либо изменений не претерпела». А это означает, что защитники В.Чертовича держали круговую оборону и было их много. Любопытно, что среди экспертов для рассмотрения дела прокуратура привлекала даже профессора В.Акулова, который еще в 2000 г. представлял интересы В.Чертовича в суде по делу об издании книги «Война по законам подлости».

Но, как известно, сколько правду ни прячь, а она рано или поздно прорежется.

Первыми антисемитов назвали антисемитами те, от кого этого меньше всего ожидали — высшие чины Православной церкви — шесть протоиереев Минской епархии. На волне конфликта с В.Чертовичем они направили ему 23 июня сего года «Пастырское увещевание Минского епархиального совета», благословенное митрополитом Филаретом.

Не будем вникать в суть проблем, связанных с тем, что В.Чертович фактически предал интересы тех, кто доверил ему дело «утоления потребности православных общин в богослужебной и просветительской литературе». Зная, что «получить официальную поддержку Православной Церкви [своим] личным политическим взглядам, планам и амбициям не удастся», В.Чертович мнение Священноначалия стал попросту игнорировать.

«В 1999 году, — пишут авторы «увещевания» В.Чертовичу, — без консультаций с Минским епархиальным управлением и без благословения Священноначалия Вы издали книгу «Война по законам подлости», в которой самым вульгарным способом попытались совместить необольшевистские взгляды на политические процессы в современном обществе, грубый антисемитизм и христианскую фразеологию. Наряду с известными, но извращенно интерпретируемыми историческими фактами, сборник содержал также и весьма одиозные материалы, нередко почерпнутые из чуждых Церкви источников. Издание этой книги могло бы оставаться на Вашей совести..., но книга была издана под грифом «Православной инициативы», а это создавало в обществе впечатление, что такова позиция всей Белорусской Православной Церкви. Сегодня не остается сомнений в том, что Вы намеренно и вполне осознанно сделали этот провокационный шаг...

...Магазин [«Православная книга»] стал местом распространения одиозной информации раскольнического, националистического и антисемитского характера. Торговая точка под [этой] вывеской по-прежнему претендовала на статус «культурно-просветительского центра», тогда как просвещение здесь больше заменялось банальной вербовкой антисемитски настроенных сторонников, а содержание собственной печатной продукции ЗАО становилось все труднее совместить с Православием...

... Ваши последние действия свидетельствуют, что Вы забыли о своих многократных покаяниях, которые подчас коленопреклоненно приносили Патриаршему Экзарху за вред, причиненный Белорусской Православной Церкви в результате Вашей постоянной провокационной деятельности... Вы забыли, наконец, о своей ответственности за пролитую Вами в состоянии алкогольного опьянения кровь человека, когда Минская епархия, в которую Вы сегодня бросаете камни, стремилась облегчить Вашу участь.

Ваша возмутительная издательская деятельность 2004 — 2005 годов достигла апогея, когда вы предприняли выход в свет объемной книги «Приговор убивающим Россию»... Изданием этой книги Вы... заняли вредоносную позицию псевдохристианского кликушества. Таковы впечатления от этого сборника, — таков же и духовный диагноз Вашего нынешнего образа мыслей и способа действий. Впрочем, раздвоение Ваших взглядов уже давно вызывает недоумение, поскольку ни для кого не секрет, что Ваши ближайшие родственники проживают в Израиле — в государстве, которое вы столь рьяно критикуете...

Выйдя из состава ЗАО «Православная инициатива», Минская епархия Белорусской Православной Церкви свидетельствует свою непричастность к Вашим личным инициативам и их последствиям...»

Вот такой документ. Наконец-то нашелся кто-то, кто впервые сказал то, что боялась (или не хотела) признать прокуратура — наличие в республике развитой инфраструктуры, штампующей антисемитскую литературу. Но, судя по всему, выход епархии из состава ЗАО, в котором доля ее составляла 70% вложенного капитала, не привел к тому, что ЗАО (теперь уже) «Христианская инициатива» очень пострадало. В магазине «Православная книга» можно купить очередной составленный и изданный В.Чертовичем еще в 2004 году антисемитский сборник «Евреи и неевреи о сионизме» — набор карикатур и перепечатанных из российской шовинистической прессы статей, наполненных невероятными антиеврейскими инсинуациями.

Но настоящим подарком для антисемитов стал видеофильм (есть и DVD-вариант) «Россия с ножом в спине. Еврейский фашизм и геноцид русского народа» (Студия «Куликово поле», 2005 г.). Как написано в аннотации, «это фильм о губительном еврейском засилье в современной России. Фильм о еврейском фашизме и целенаправленном геноциде русского народа, о дьявольском, сатанинском культе талмудического иудаизма, о его страшном человеконенавистническом вероучении».

С протестом против издания книги «Приговор убивающим Россию» и продажи видеофильма «Россия с ножом в спине» в магазине «Православная книга» выступила группа бывших парламентариев: советник старших епископов евангельских церквей Беларуси, доктор философии Иван Пашкевич, генерал-майор в отставке, кавалер ордена Сергия Радонежского Валерий Фролов, трехкратный олимпийский чемпион Владимир Парфенович и политолог Игорь Баслык. Книгу они однозначно оценили как расистскую и фашистскую, а высказывания о евреях и их роли в жизни назвали «оскорбительными и уничижительными по отношению к еврейскому народу».

Свое заявление авторы протеста направили в прокуратуру Республики Беларусь с просьбой дать правовую оценку деятельности ЗАО «Православная инициатива» и магазина «Православная книга», которые «способствуют распространению антисемитских, фашистских изданий». Особую тревогу у авторов вызывает тот факт, что «русофобская, антисемитская книга [«Приговор убивающим Россию»] отпечатана не в частном издательстве, а на белорусском государственном предприятии «Полиграфический комбинат им. Я.Коласа» в Минске. Зная о тотальном контроле действующей власти Республики Беларусь за средствами массовой информации, в том числе за издательствами, настораживает тот факт, что печатание книги не было остановлено и не получило правовой оценки ни со стороны Министерства информации, ни со стороны идеологического управления Администрации белорусского президента... Не будем строить догадок, что происходило все это с ведома или одобрения высоких белорусских чиновников». (Текст заявления распространен через Интернет.)

Кстати, фильм «Россия с ножом в спине. Еврейский фашизм и геноцид русского народа» не первый фильм антисемитского содержания, видеокопии которого свободно продаются в киосках системы магазина «Православная книга». К их числу можно отнести и 4-серийную ленту украинских кинематографистов «Генералиссимус», посвященную прославлению личности И.Сталина (премьера в Беларуси состоялась на первом канале телевидения в период с 19 по 22 декабря 2005 года). Первая серия фильма посвящена отнюдь не Сталину, а Троцкому, который якобы выполнял задание международных сионистских кругов, планировавших «захват мира», и с этой целью «приехал или был послан в Россию».

Вопреки всем установившимся историческим реалиям, фильм утверждает, что реальная власть в СССР принадлежала Троцкому; что не Троцкий, а Сталин на самом деле был «оппозиционером»; что Троцкий «комплектовал руководящие органы страны из числа сионистов»; что церкви были ограблены троцкистами, а ценности вывезены в Америку; что ограбление православной церкви было для Троцкого «богоборческой целью»; что именно Троцкий принял решение об убийстве царской семьи, а само преступление совершено исключительно евреями, и т.д. и т.п. Ссылки при этом делаются не на архивные или энциклопедические источники, а на весьма низкопробные антисемитские брошюры. Антиисторизм фильма очевиден, как очевиден и антисемитизм тех, кто его тиражирует для домашнего просмотра.

* * *

Сегодня Беларусь стала местом ожесточенной схватки тех, кто стремится к либерализации общественной атмосферы, с теми, кто ради личной корысти и удовлетворения личных амбиций пытается вернуть общество к тоталитарным традициям недавнего прошлого. Описанные нами события по обструкции такого гнезда неонацизма, которым является ЗАО «Христианская инициатива», показывает, что поступательное движение истории остановить нельзя. Возврат к прошлому уже невозможен, как бы за него ни цеплялись всевозможные чертовичи и акуловы.

Яков БАСИН.

Жыхары Беларусі, на вялікі жаль, у масе сваёй слаба абазнаныя ў гісторыі ўласнай краіны. Школьныя веды па гэтым прадмеце дзесяцігоддзямі былі ідэалагізаваныя (падобная тэндэнцыя назіраецца і ў апошняе дзесяцігоддзе). Што ўжо гаварыць пра царкоўную гісторыю! У савецкі час рэлігія лічылася толькі «опіумам для народу», цяперашнія чыноўнікі свядома і падсвядома працягваюць кіравацца гэтым ментальным штампам, бо ў многіх выпадках гэта зручна кіроўнай уладзе, хоць знешне, падаецца, «карцінка» інакшая.

Грамадзянская ініцыятыва «За свабоднае веравызнанне» выдала брашуру «Аўтакефалія», каб дапамагчы тым, хто імкнецца самастойна ліквідаваць «белыя плямы» ў ведах пра сваю краіну, пра гісторыю хрысціянскай царквы, пра аўтакефалію — адміністрацыйную самастойнасць памесных праваслаўных цэркваў, у прыватнасці.

Перадрукоўваем з гэтай брашуры артыкул пра гісторыю беларускай аўтакефаліі, напісаны доктарам Янкам Запруднікам, знаным навукоўцам і грамадска-палітычным дзеячам, які стала жыве ў ЗША і актыўна дбае пра Бацькаўшчыну, нягледзячы на свой паважны ўзрост і не вельмі спрыяльныя жыццёвыя варункі. Аўтар падае храналогію падзеяў ад прыходу хрысціянства на землі сучаснай Беларусі (яшчэ ў тыя часы, калі яно не было падзеленае на ўсходні і заходні кірункі) да XX стагоддзя, першых паваенных гадоў, калі іерархі адноўленай Беларускай аўтакефальнай царквы апынуліся ў эміграцыі і далучыліся да Расійскай праваслаўнай царквы за рубяжом, а вернікі, што не пайшлі за імі, мусілі самі ўпарадкаваць уласнае духоўнае жыццё.

Беларуская аўтакефалія

(Храналёгія падзеяў)

Слова «аўтакефалія» абазначае самастойнасьць царквы як інстытуцыі, інакш кажучы, царкоўнае самакіраваньне (па-грэцку *аўта* — сам, *кефале* — галава). Ерархія аўтакефальнай царквы не прызнае над сабой іншых царкоўных аўтарытэтаў, не падлягае ані духоўнай, ані адміністрацыйнай уладзе іншай царкоўнай юрысдыкцыі. Шмат якія аўтакефальныя цэрквы (прыкладам, румынская, сэрбская, баўгарская й інш.) — адначасна й цэрквы нацыянальныя.

Ідэя аўтакефаліі ўзьнікла яшчэ за часамі раньняга хрысьціянства як вынік супярэчнасьці паміж усяленскім, унівэрсальным характарам Хрыстовае навукі, з аднаго боку, а з другога — геаграфічнай абмежаванасьцю дзяржаўных утварэньняў. Ідэя аўтакефаліі выплывае таксама з супадзеньня ў шмат якіх выпадках інтарэсаў царкоўных зь інтарэсамі дзяржаўнымі, нацыянальнымі.

У сярэднявеччы й пазьней царкоўныя ерархі ўваходзілі ў склад княскіх і каралеўскіх радаў, стаялі блізка да дзяржаўнай палітыкі. Зразумела, што кіраўнікі дзяржаваў (княстваў) — людзі сьвецкія — імкнуліся выкарыстоўваць або й падпарадкоўваць сабе царкву. Гэтак было ў Візантыі, адкуль прыйшло ў X стагодзьдзі хрысьціянства ў Кіеўскую Русь і на беларускія землі. Зь Візантыі, дзе імпэратар уважаўся за пасланца Бога на зямлі (адсюль і зьява гэтак званага цэзарапапізму — цэзар і папа ў адной асобе), прыйшла на Русь спалучанасьць улады сьвецкае з уладай рэлігійнай (царкоўнай).

Першымі мітрапалітамі на Русі былі грэкі, бо й вера прыйшла ад іх. Грэкамі былі візантыйскі імпэратар і Канстантынопальскі патрыярх. Ад часу хрышчэньня Русі кіеўскім князем Уладзімірам у 988 г. і да мангольскага нашэсьця ў 1240 годзе, у Кіеве, цэнтры рускага хрысьціянства (слова «рускі» тут ужываецца ў сэнсе гістарычнай Русі, а не пазьнейшае Маскоўшчыны — Расеі), было 23 мітрапаліты, усе апрача двух — грэкі. Мітрапалітамі мясцовага (рускага) паходжаньня былі Іларыён (1051—1054) і Клімэнт Смаляціч (1147—1154). Але ніводзін зь іх не атрымаў блаславенства на мітрапалічы прастол ад Канстантынопальскага патрыярха: дзяржаўныя інтарэсы Кіева і Канстантынопаля былі розныя. Калі кіеўскі князь Ізяслаў Мсьціславіч пастанавіў, каб мітрапалітам рускай царквы заміж грэка Міхаіла стаўся епіскап смаленскі Клімэнт Смаляціч, бун матываваў сваю пастанову гэткімі словамі: «чрес сию патриархов в Руси власть цари греческие ищут над нами властвовать и повелевать, что против нашей чести и пользы». (1) Як бачым, з самага пачатку дзяржава й царква супольна баранілі свой гонар і інтарэсы.

Першыя епархіі праваслаўнай царквы ў Беларусі паўсталі ў Полацку (992), Тураве (1005), Смаленску (1137). Выдатнымі дзеячамі раньняга праваслаўя на беларускіх землях былі епіскап полацкі Міна (памёр каля 1116), епіскап смаленскі Клімэнт Смаляціч (?—пасьля 1164), князёўна полацкая Прадслава-Эўфрасіньня (каля 1120—1173), епіскап тураўскі Кірыла (к. 1130—к. 1180) ды іншыя. У Полацку ў 1066 годзе князь Усяслаў Брачыславіч (Чарадзей) закончыў будаўніцтва велічнага Сафійскага сабору, чым падкрэсьліў роўнасьць Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Там падобныя сьвятыні былі пабудаваныя, адпаведна, у 1037 і 1050 гадох. Полацак, Тураў ды іншыя гарады сталіся цэнтрамі пашырэньня пісьменнасьці й асьветніцкае дзейнасьці. Ад самага пачатку заявілі сябе сваёй арыгінальнасьцю полацкая царкоўная архітэктура (дойлід Іван), мастацтва (Лазар Богша, стваральнік крыжа сьв. Эўфрасіньні). У самым раньнім пэрыядзе рэлігійна-царкоўнага жыцьця выявіўся самабытны характар беларускае зямлі, гонар і славу якое разбудоўвала, пашырала й бараніла царква.



Пасьля таго як Кіеў, сталіца мітрапалітаў, амаль датла быў зьнішчаны татара-мангольскім нашэсьцем у 1240 годзе, мітрапаліты адмовіліся жыць у Кіеве. Мітрапаліт Кірыла II (1238—1280), з рускіх, разьязджаў па цэлай мітраполіі, але найдаўжэй затрымоўваўся ва Уладзіміры-на-Клязьме. А ягоны наступнік, грэк Максім (1283—1305), пасьля таго як у 1299 г. Кіеў ізноў быў спалены, ужо назаўсёды пасяліўся ва Уладзіміры.

Ад сярэдзіны XIII стагодзьдзя на землях Беларусі пачало умацоўвацца й пашырацца Вялікае Княства Літоўскае, Рускае й Жамойцкае (ВКЛ), палітычныя патрэбы якога паставілі на парадак дня пытаньне аб сваёй асобнай мітраполіі.

Час заснаваньня й станаўленьня Літоўскай (у сёньняшняй тэрміналёгіі — беларускай) мітраполіі слаба дасьледаваны, а таму й спрэчны. Некаторыя крыніцы называюць 1291 год годам пастаўленьня асобнага мітрапаліта для ВКЛ, але імя ягонага не называюць. Сьпіс ведамых беларускіх мітрапалітаў пачынаецца 1315 годам, калі Літоўскую мітраполію ачоліў грэк Тэафіл (1315—1330).

Канстантынопаль, аднак, далей намагаўся захоўваць цэласьць Рускай (г. зн. Кіеўскай) мітраполіі. Гэта ляжала ў інтарэсах візантыйскіх імпэратараў і патрыярхаў, асабліва ў сувязі з турэцкай пагрозай Візантыі. Канстантынопаль хацеў бачыць на поўначы адну вялікую саюзную царкоўную структуру, падзел якое быў яму зусім не на руку. Калі галіцкі князь Юры Львовіч, захацеўшы мець асобную мітраполію, падаў Канстантынопальскаму патрыярху свайго кандыдата ў мітрапаліты, Пятра, дык патрыярх паставіў Пятра, але не як мітрапаліта Галіцкага, а «ўсяе Русі» (1308—1326). Пётар стаўся саюзьнікам маскоўскага князя Івана Каліты й жыў у Маскве. Ягоны наступнік Тэагност (1328—1353) канчальна перанёс у Маскву й мітрапалічую катэдру. У 1353 г. Канстантынопальскі Сабор асобнай пастановай яшчэ раз падкрэсьліў, што Руская мітраполія не павінна дзяліцца ды што ў будучыні мітрапаліты на Русь павінны прызначацца з грэкаў.

Пастанове Канстантынопальскага Сабору не падпарадкаваўся, аднак, праваслаўны вялікі князь Альгерд. Князі ВКЛ апіраліся на фэўдалаў беларускіх земляў, «падтрымлівалі праваслаўную царкву, якая ў XIV стагодзьдзі займала пануючае становішча ў дзяржаве». (2) Князь Альгерд падарункамі патрыярху й дыпляматыяй дамогся, што для ВКЛ быў пастаўлены свой мітрапаліт, Раман (1354—1362). Рэзыдэнцыяй літоўскіх мітрапалітаў ад самага пачатку быў Навагрудак, першая сталіца ВКЛ. Але коратка перад дабраслаўленьнем Рамана на мітрапалічы прастол Канстантынопаль паставіў таксама і мітрапаліта для Масквы — Аляксея. Паміж Раманам і Аляксеем пачалося змаганьне за Кіеўскую мітраполію й тытул «Кіеўскі» як найбольш прэстыжны. У гэтае змаганьне ўлучыліся й сьвецкія чыньнікі, паколькі йшла вайна паміж ВКЛ і Маскоўшчынай.

Канстантынопальскі патрыярх спрабаваў быў скасаваць Літоўскую мітраполію, але энэргічная акцыя князя Альгерда не дапусьціла да гэтага. Патрыярх паслаў тады ў ВКЛ свайго апакрысіярыя (прадстаўніка), баўгарскага іераманаха Кіпрыяна, каб той давёў да прымірэньня паміж мітрапалітамі літоўскім і маскоўскім.

Кіпрыян пабачыў, аднак, што праваслаўныя жыхары ВКЛ ня могуць быць у залежнасьці ад маскоўскага мітрапаліта і сказаў пра гэта князю Альгерду. Гэткі пагляд Кіпрыяна спадабаўся Альгерду, і, калі мітрапаліт Раман памёр у 1362 г., Альгерд выставіў Кіпрыянаву кандыдатуру ў мітрапаліты ВКЛ. Інтранізацыя Кіпрыяна адбылася ў Канстантынопалі ў 1375 годзе.

У 1377 г. памёр вялікі князь Альгерд. Неўзабаве пасьля гэтага, у 1380 г., адбылася гістарычная бітва на Куліковым полі, у якой выразным пераможцам выйшаў маскоўскі вялікі князь Дзімітры Данскі. Мітрапаліт Кіпрыян, які, трэба меркаваць, быў патрыётам Баўгарыі й шукаў сваёй бацькаўшчыне моцнага праваслаўнага саюзьніка супраць туркаў, што пагражалі і Баўгарыі, і Візантыі, паехаў у 1381 г. у Маскву, дзе быў урачыста сустрэты.

Калі ў 1389 г. памёр маскоўскі прэтэндэнт на мітрапаліта, Пімен, Кіпрыян застаўся адзіным праўным галавою царквы «ўсяе Русі». Ад 1390 г. і аж да сьмерці ў 1406 г. Кіпрыян жыў у Маскве, дзе разгарнуў буйную арганізацыйную дзейнасьць. Вялікае Княства Літоўскае паміж 1390 і 1415 гадамі заставалася без свайго мітрапаліта, царкоўнае жыцьцё ў ВКЛ рэгуляваў, пакуль жыў, мітрапаліт Кіпрыян з Масквы. Напрыканцы XIV стагодзьдзя, за часамі вялікага князя Вітаўта, дачыненьні ВКЛ з Маскоўшчынай былі мірныя. Вітаўтава дачка Софія выйшла замуж за маскоўскага князя Васіля. Аднак спакой паміж Вільняй і Масквой патрываў ня доўга.

У 1408 г. Канстантынопальскі патрыярх, адмовіўшыся зацьвердзіць Вітаўтавага кандыдата, полацкага епіскапа Тэадосія, на мітрапаліта Літоўскага, прыслаў грэка Фоція як мітрапаліта «Кіеўскага і ўсяе Русі». Патрыярх дaручыў Фоцію аб'яднаць пад сваім кіраўніцтвам усе епархіі ВКЛ. Тым часам ізноў аднавіліся ваенныя дзеяньні паміж ВКЛ і Маскоўшчынай за тэрыторыі ў раёне Пскова й Ноўгарада. Мітрапаліт Фоцій, як сьведчыць гісторык Ігар Грэкаў, «разам з князем Васілём энэргічна супрацьдзеілі пашырэньню літоўскага ўплыву ў «нэўтральнай» паласе рускіх земляў». (3)

У 1414 г. вялікі князь Вітаўт загадаў склікаць у Наваградку сабор епіскапаў ВКЛ. На становішча мітрапаліта была выстаўлена кандыдатура Кіпрыянавага пляменьніка Рыгора Цамблака, але Канстантынопаль двойчы адмовіўся зацьвердзіць яе. Тады Вітаўт дамогся ад сабору, каб новы мітрапаліт быў пастаўлены бяз згоды патрыярха. Абодва мітрапаліты, аднак, літоўскі й маскоўскі, насілі той самы тытул: «Кіеўскі і ўсяе Русі». І ў гэтым дубляваньні наяўна адлюстроўваліся экспансіянісцкія праграмы дзьвюх сталіцаў, Вільні й Масквы, іхная канкурэнцыя за аваладаньне «рускімі» землямі.

Па сьмерці Рыгора Цамблака ў 1419 ці 1420 г. Літоўская мітраполія засталася без свайго мітрапаліта аж да 1433 г., калі мітрапалічую катэдру заняў, узьведзены на яе Канстантынопальскім патрыярхам Іосіфам, смаленскі епіскап Герасім. Новаму ўладыку не пашчасьціла. Вялікі князь Сьвідрыгайла (Вітаўт памёр у 1430 г.) западозрыў мітрапаліта ў сувязях зь ягонымі ворагамі і загадаў спаліць яго ў Віцебску ў 1435 г. (паводле іншых крыніцаў — у 1437 г.). Мітрапаліт Герасім увесь час знаходзіўся ў Смаленску, але ўсе ягоныя наступнікі засядалі ў Наваградку, адкуль часта наведваліся ў Вільню ды ў іншыя месцы мітраполіі, межы якое мяняліся. Апрача беларускіх земляў, у мітраполію спачатку ўваходзілі Кіеўшчына, Галіччына й Валынь.

Паміж 1437 і 1458 гадамі Навагрудзкая мітрапалічая катэдра была незанятай. Тымчасам маскоўскі мітрапаліт, грэк Ізыдар, выявіўся прыхільнікам уніі з Рымам. Ізыдар падпісаў унійны акт у Флярэнцыі ў 1439 г., у выніку чаго яму давялося ўцякаць з Масквы. У Маскве ў 1448 г. быў абраны за мітрапаліта «свой» духоўнік, Іона, які не паехаў па блаславенства да Канстантынопальскага патрыярха. Канстантынопаль, абложаны турэцкімі войскамі, дажываў свае апошнія гады як свабодная сталіца праваслаўя. Год 1448-ы лічыцца пачаткам аўтакефаліі Расейскае Праваслаўнае Царквы. Мітрапаліт Іона рабіў спробы пашырыць сваю ўладу і на ВКЛ, напісаў пасланьне «купно литовско-галицкому людзтву», наведаў Галіч, Львоў, Вільню й Наваградак. Кароль польскі й вялікі князь літоўскі Казімер выдаў яму грамату ў 1451 г., што ахоўвала ягоныя правы ў ВКЛ.

У 1458 г., пяць гадоў пасьля ўпадку Візантыі, Канстантынопальскі патрыярх, які прыняў Флярэнцкую унію й жыў у Рыме, прыслаў у Навагрудак свайго мітрапаліта-уніята Рыгора Баўгарына з тытулам «Кіеўскі, Літоўскі і ўсяе Русі». Пачалося змаганьне з праваслаўнымі, у якое ўлучыўся й маскоўскі мітрапаліт Іона. У Маскве тым часам сабор епіскапаў пастанавіў на загад вялікага князя маскоўскага выбіраць мітрапаліта без паразуменьня з грэкамі. Навагрудзкі мітрапаліт-уніят Рыгор пасьля дзесяці гадоў змаганьня за унію вярнуўся назад да праваслаўя і неўзабаве перад сьмерцю (у 1473 або 1475 г.) быў зацьверджаны на сваім мітрапалічым прастоле Канстантынопальскім патрыярхам Дзіянісам. Пахаваны ў Навагрудку.

У далейшым, ва ўмовах частых войнаў паміж ВКЛ і Маскоўшчынай, існавалі дзьве мітраполіі, адна з палітычным цэнтрам у Вільні, другая ў Маскве. Маскоўскія мітрапаліты адмовіліся ад тытулу «Кіеўскі», але частку свайго тытулу «і ўсяе Русі» тлумачылі шырока, улучаючы ў гэты панятак украінскія й беларускія землі. Тытул «і ўсяе Русі» абодвух мітрапалітаў, кіеўскага (або літоўска-навагрудзкага) і маскоўскага, сымбалізаваў сабой змаганьне ВКЛ і Маскоўшчыны ня толькі за тэрыторыі, але й за гістарычную спадчыну.

У 1589 г. Масква, якая абвясьціла сябе яшчэ на пачатку XVI ст. «трэцім і апошнім Рымам», дамаглася ад Канстантынопаля права мець упершыню свайго патрыярха — «Маскоўскага і ўсяе Русі». Але ўстанаўленьне патрыяршае ўлады ў Маскве не закранула самастойнасьці Літоўска-Навагрудзкае мітраполіі. Гісторык Усевалад Ігнатоўскі памылкова піша, што пасьля 1589 г. «юрыдычна зноў праваслаўная царква Літвы і Беларусі была пастаўлена ў іерархічнае падданства Маскве». (4) Аўтакефалія праваслаўнае царквы ў Беларусі была перапынена толькі ў выніку царкоўнай уніі 1596 г., калі ўсе беларускія праваслаўныя епіскапы сталіся уніятамі.

У пэрыядзе 1315—1596 гадоў мітрапалітамі Літоўска-Навагрудзкае мітраполіі былі (у крыніцах некаторыя гады падаюцца па-рознаму):

Тэафіл (1315—1330),
Тэадарэт (1353—1354),
Раман (1354—1362),
Кіпрыян (1375—1381),
Рыгор Цамблак (1414—1419),
Герасім Смаленскі (1433—1435),
Рыгор Баўгарын (1458—1473),
Сьпірыдон (1473—1474),
Місаіл Пятруцкі (1475—1480),
Сымон Полацкі (1481—1488),
Іона I Глезна (1489—1499),
Макар I (1495—1497),
Іосіф Баўгарыновіч (1498—1501),
Іона II (1503—1506),
Іосіф Солтан (1508—1522),
Іосіф III (1522—1534),
Макар II (1535—1556),
Сыльвэстар Бялькевіч (1556—1567),
Іона III Пратасэвіч (1567—1576),
Ільля Куча, галічанін (1577—1579),
Анісіфор Дзявочка (1579—1588),
Міхаіл Рагоза (1589—1595).

Далейшыя мітрапаліты ў Рэчы Паспалітай былі уніятамі. Ва ўмовах рэлігійнага змаганьня й польскага наступу на праваслаўе вялікую ролю ў абароне Праваслаўнае Царквы ў Беларусі і Украіне адыгралі праваслаўныя брацтвы. Арганізацыі гэтыя пачалі паўставаць у 1580-х гадох і дзейнічалі праз усё XVII стагодзьдзе, засноўвалі школы, выдавалі рэлігійную літаратуру. Дзейнасьць брацтваў у іхнай пачатковай фазе падтрымвалі багатыя магнаты, каторыя яшчэ трымаліся свае праваслаўнае веры.

Іерархія Праваслаўнай Царквы аднавілася толькі ў 1620 г., калі Канстантынопальскі патрыярх Тэафан блаславіў на прастол Кіеўскага мітрапаліта Іова Барэцкага. Тады ж віленскі архімандрыт Мялеці Сматрыцкі стаўся епіскапам Полацкім, Ісаія Капінскі быў высьвячаны на епіскапа Смаленскага, а на Турава-Пінскую епархію быў пастаўлены грэк Аўраам. У новым пэрыядзе Праваслаўная Царква на землях Украіны й Беларусі была падпарадкаваная Канстантынопальскаму патрыярху. Мітрапаліты ў гэтым часе знаходзіліся ўжо не ў Навагрудку, а ў Кіеве й мелі тытул «Кіеўскага, Галіцкага і ўсяе Русі, Экзарха Канстантынопальскага Прастолу». Мітрапаліт засядаў у сойме Рэчы Паспалітай. У Беларусі ў пэрыядзе 1620—1795 гадоў была толькі адна праваслаўная епархія — Магілёўская, епіскапы якой насілі тытул «Аршанскі, Віцебскі, Мсьціслаўскі і Магілёўскі». Царкоўныя ж прыходы заходняй Беларусі — на Віленшчыне, Навагрудчыне, Піншчыне — увaходзілі ў склад мітрапалічае Кіеўскае епархіі.

Пасьля таго, як гетман Багдан Хмяльніцкі далучыў Украіну да Расеі, Кіеўская мітраполія развалілася на дзьве: Маскоўскую і патрыяршую Канстантынопальскую. Масква пачала ціснуць на Польшчу і Канстантынопаль, каб падпарадкаваць сабе Кіеўскі мітрапалічы прастол. Гэтага яна дасягнула ў 1685 г., калі Канстантынопальскі патрыярх Дзіяніс IV выдаў грамату, адмовіўшыся ад свае патрыяршае ўлады над Кіеўскай мітраполіяй. Таго ж самага году абраны на Кіеўскім Саборы за мітрапаліта епіскап луцкі Гедэон быў высьвячаны на свой пасад у Маскве. «Вечны мір» паміж Расеяй і Польшчай, падпісаны ў 1686 г., замацаваў палітычна перанос цэнтру праваслаўя з Кіева ў Маскву. Неўзабаве пасьля гэтага Кіеўская мітраполія была зьведзена да статусу епархіі Маскоўскага патрыярхату. Магілёўска-Беларуская епархія пачала зьвяртацца ў сваіх патрэбах беспасярэдне ў Маскву.

Два гады перад другім падзелам Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1793 годзе, была зроблена спроба ўнезалежніць беларускае й украінскае праваслаўе ад Масквы, каб пазбавіць апошнюю магчымасці ўмешвацца ў

(Заканчэнне на стар. 12.)

Беларуская аўтакефалія

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 10–11.)

нутраныя справы каралеўства. Пастановаю Чатырохгадовага (1788—1792) сойму быў склікан ў Пінску ў 1791 годзе агульны зьезд праваслаўнага духавенства й сьвецкіх вернікаў. Зьезд гэты ці, як яго называлі, генэральная кангрэгацыя, або Нацыянальны сабор Праваслаўных цэркваў каралеўства Польскага й Вялікага княства Літоўскага, прыняў шэраг пастановаў, у тым ліку пра аўтакефалію Праваслаўнай Царквы й духоўную сувязь з Канстантынопальскім патрыярхам. Пінская генэральная кангрэгацыя ўтварыла Нацыянальны сынод з цэнтрам у Пінску для кіраваньня царкоўнымі справамі праваслаўных, распрацавала арганізацыйную структуру Праваслаўнай Царквы. Сойм, у духу новай Канстытуцыі 1791 г., якая пабольшыла рэлігійную свабоду ў Рэчы Паспалітай, зацьвердзіў пастановы Пінскай кангрэгацыі. Але над Рэччу Паспалітай быў ужо занесены меч другога падзелу (1793 г.), за якім хутка настаў і апошні (1795 г.).

З поўным далучэньнем Беларусі да Расеі пачаўся новы пэрыяд у гісторыі беларускага праваслаўя. Патрыяршая ўлада ў Маскоўшчыне была скасаваная яшчэ за часамі Пятра I у 1700 годзе. На чале Царквы цар паставіў калегію, Сьвяшчэнны Сынод, падпарадкаваны міністру (обэр-пракурору) як у сьвецкіх, так і ў рэлігійных справах. Царква стала поўнасьцю прыладай дзяржавы. Быў палітызаваны яшчэ глыбей сам панятак веры, часта называнай у афіцыйных зваротах ужо ня «рускай», а «греко-российской».

Русыфікацыя праваслаўнай царквы ў Беларусі, пачатая яшчэ царыцай Кацярынай II, узмацнілася асабліва пасьля паўстаньня 1863 г., калі праводзілася палітыка насаджэньня расейскага чыноўніцтва, у тым ліку й царкоўных саноўнікаў ды сьвятароў. У духоўных і настаўніцкіх сэмінарыях запанаваў «истинно русский» дух, беларуская мова і блізка не дапушчалася да афіцыйнага ўжытку ў царкоўным жыцьці.

Пасьля таго, як Лютаўская й Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. пакончылі з царскім самаўладзтвам і ў БССР усталявалася беларуская дзяржаўнасьць, на парадак дня стала справа аднаўленьня аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы. У ліпені 1922 г. быў скліканы ў Менску сабор, які, падтрымаўшы ідэю «самабытнасьці Беларускай Царквы і ейнага права на нацыянальнае самавызначэньне», абвесьціў 23 ліпеня аўтакефалію БПЦ. Крок гэты, згодна з пасланьнем Другога Сабору БПЦ, што адбыўся ў Менску ў жніўні 1927 г., быў «кананічна заканамерным і гістарычна неабходным». Акт аўтакефаліі, як казалася ў тым жа пасланьні, быў угрунтаваны на прынцыпе, што самакіраўніцтва становіць «душу найстарэйшага царкоўнага заканадаўства й практыкі (34-е і 37-е Апостальскія правілы, 9-е правіла Антыяхійскага Сабору)». (5) Апостальскае правіла 34-е кажа: «Епіскапам усякага народу належыцца ведаць першага спаміж сябе і прызнаць яго як галаву, і не тварыць безь ягонай развагі нічога, што перавышала б іхную ўладу». Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву ачоліў архіепіскап Менскі мітрапаліт Мэлхісэдэк Раеўскі.

Савецкая ўлада, аднак, хутка пасьля свайго ўмацаваньня павяла палітыку жорсткага перасьледу рэлігіі, канфіскуючы царкоўную маёмасьць і вынішчаючы сьвятарства. Былі арыштаваныя й загінулі ў канцлягерах або на выгнаньні сам мітрапаліт Мэлхісэдэк, а таксама епіскапы Мазырскі Іаан Пашын, Слуцкі Мікалай Шэмаціла ды Бабруйскі Філарэт Раменскі.

Зьнішчаючы царкву фізычна, камуністы змагаліся зь ёй таксама шляхам дывэрсіі. Дывэрсіяй быў рух за так званую абнаўленскую царкву. Падтрымваныя ўладай абнаўленцы намагаліся па цэлым Савецкім Саюзе «рэфармаваць» царкву шэрагам мерапрыемстваў дагматычнага й адміністрацыйнага характару. У Беларусі абнаўленцы абвесьцілі ў травені 1924 г. аўтаномію свае царквы, а ў студзені 1925 г. абралі свой Беларускі Сьвяшчэнны Сынод. Аўтаномія беларускіх абнаўленцаў была скасаваная ў сьнежні 1934 г., хоць сама царква трывала да пачатку вайны ў 1941 годзе. Паводле прафэсара Томаса Бэрда, «абнаўленская схізма не карысталася вялікай удачай сярод вернікаў у Беларусі». (6)

Пад Польшчай, дзе ў Заходняй Беларусі й Заходняй Украіне жыло каля пяці мільёнаў праваслаўных, аўтакефалія была аднаўленая актам (томасам) Канстантынопальскага патрыярха Рыгора III у лістападзе 1924 году. У сваім томасе патрыярх пісаў: «Першае адлучэньне ад Нашага Прастолу Кіеўскай мітраполіі і Праваслаўных мітрапалітаў Літвы і Польшчы, што залежалі ад яе, а таксама далучэньне іх да Сьв. Маскоўскай Царквы адбылося аніяк не паводле прадпісаньня кананічных правілаў». (7) Польскую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву (ПАПЦ) ачоліў мітрапаліт Дзяніс Валедзінскі з тытулам «Варшаўскі і ўсяе Польшчы». Мітраполія складалася зь пяці епархіяў, тры зь якіх былі на беларускіх землях: Віленская, Гарадзенская й Палеская. У гэтых трох епархіях налічвалася больш за дзьве тысячы цэркваў і пятнаццаць манастыроў. Маскоўская патрыярхія аднак не прызнала аўтакефаліі ПАПЦ.

Пасьля далучэньня Заходняй Беларусі да БССР у верасьні 1939 г. праваслаўныя ерархі ПАПЦ падпарадкаваліся Маскоўскаму патрыярху. Архіепіскап Пінска-Навагрудзкі Панцялейман Ражаноўскі быў назначаны за экзарха Заходніх Украіны й Беларусі.

У часе нямецкай акупацыі (1941—1944 гг.) праваслаўныя дзеячы, духоўныя й сьвецкія, зрабілі наважаны крок да аднаўленьня аўтакефаліі БПЦ. Перамагаючы супрацiў узгадаваных у расейскім духу некаторых ерархаў, яны здолелі дамагчыся скліканьня Усебеларускага Сабору, які адбыўся ў Менску 30 жніўня — 2 верасьня 1942 году. Сабор аднавіў аўтакефальную Беларускую Праваслаўную Царкву, прыняў статут ды іншыя дакумэнты. Ня ўсе пастановы сабору, аднак, былі праведзеныя ў жыцьцё, часткава дзеля абставінаў вайны, а часткава дзеля ідэйнага ваганьня ерархаў, іхнага русафільства.

Апынуўшыся на эміграцыі ў Заходняй Нямеччыне, ерархі БАПЦ — мітрапаліт Панцялейман, архіепіскап Філяфей Нарко, епіскапы Апанас Мартас, Іаан Лаўрыненка, Вэнэдыкт Бабкоўскі, Сьцяпан Сеўба і Рыгор Барышкевіч — далучыліся ў 1946 г. да Расейскай Праваслаўнай Царквы за Рубяжом, пакінуўшы сваіх вернікаў, якія за імі не пайшлі, на волю лёсу. Праваслаўныя беларусы на эміграцыі падзяліліся: адны, стварыўшы свае прыходы, аднавілі 5 чэрвеня 1948 г. на саборы ў Канстанцы (Заходняя Нямеччына) Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву (БАПЦ), а другія, таксама арганізаваўшыся ў прыходы, увайшлі ў юрысдыкцыю Канстантынопальскага патрыярхату. Мала хто пайшоў за ўладыкамі ў Расейскую Зарубежную Царкву. У гісторыі беларускага праваслаўя й незалежніцкай ідэі пачаўся новы пэрыяд.

Янка ЗАПРУДНІК.

Спасылкі

1. А. Ф. Замалеев, В. А. Зоц. Мыслители Киевской Руси. Изд. 2-е. Киев, 1987. С. 130.
2. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989. С. 130.
3. И. Б. Греков. Восточная Европа и упадок Золотой Орды. Москва, 1975. С. 291.
4. Усевалад Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі //Крыніца. 1990. №8. С. 40.
5. Архиепископ Афанасий Мартос. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Буэнос-Айрес, 1966. С. 260.
6. Thomas E. Bird. Orthodoxy in Byelorussia: 1917—1980 //Запісы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва. Т. 17. Нью-Ёрк, 1983. С. 153.
7. Тамсама. С. 265.

* Захоўваецца аўтарская арфаграфія.

Summary

The bulletin begins with a peculiar blank verse — short exposition of some Bible statements («And the God told a Belarusian…», page 1). Here one can also read information about the site For Religious Freedom, which has been launched not long ago.

Under the heading Monitoring (page 3–4) is published a brief survey of the current year events, as well as an article about the way how the protestant Church New Life struggles for their right to exist in their own building (page 2–3).

In the article by Yakov BASIN (page 7–9) is discussed «an official document, in which the anti-Semite is at last called the anti-Semite.» The article is about a letter written by hierarchs of the Belarussian Orthodox Church against Chertovich, a publisher and bookseller, who has spread spiteful myths and slander, trying to cover himself by the Church blessing, which he had not had.

Igor BLOKHIN tells us about the problems, which followers of the «non traditional religions» come across, for example, scientologists (page 4–6).

Under the heading Bibliography, one can read about the brochure Autocephalous, published by the Initiative For Religious Freedom (page 10–12), as well as an extract from the brochure.

Бюлетэнь
«За свабоднае веравызнанне»
Bulletin of
«For free Denomination»
№ 12, July — September 2006.
Наклад 299 экземпляраў.
Рэдактар
Валянціна Трыгубовіч.
Паштовы адрас: 220012, а/с 101, Мінск, Беларусь.
E-mail: religionfreedom@tut.by
Тэл. (+375 17) 282–42–10; 8-029–403–98-03.